2. *Агапкина, Т. П.* Переписка польских и советских писателей (к истории польско-советских литературных связей 20–30 годов) / Т. П. Агапкина // Советское славяноведение. – 1973. – № 4. – С. 96–110.

3. *Дивногорцев, А. Л.* Первые контакты советских и зарубежных библиотекарей (20-е годы) / А. Л. Дивногорцев // Советское библиотековедение. – 1985. – № 3. – С. 102–110.

4. *Falkowicz, S.* Polsko-radziecka współpraca kulturalna i naukowa w okresie międzywojennym / S. Falkowicz, M. Czernych // Dzieje najnowsze. – 1970. – № 2. – С. 105–123.

5. *Тарасова, И. В.* Роль Всесоюзного общества культурной связи с заграницей в развитии международного книгообмена в 1925–1928 гг. / И. В. Тарасова // Традиционная и инновационная наука: история, современное состояние, перспективы: сб. ст. – Уфа, 2015. – Ч. 5. – С. 83–91.

6. *Семакина, Т. Р.* Непонятая литература, подозрительные пьесы и всемогущая цензура: к вопросу об идеологических противоречиях в польско-советских культурных контактах на рубеже 1920–1930-х гг. / Т. Р. Семакина // Славянский альманах. – 2022. – № 3–4. – С. 381–393.

7. Документы и материалы по истории советско-польских отношений: в 11 т. – М., 1966. – Т. 4. – 560 с.

8. Архіў знешняй палітыкі Расійскай Федэрацыі (АЗП РФ). – Ф. 188. Воп. 7. Спр. 28.

9. Цэнтральны навуковы архіў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (ЦНА НАН Беларусі). – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 31.

10. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 68. Воп. 1. Спр. 3.

11. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 35.

12. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 23.

13. Літоўскі цэнтральны дзяржаўны архіў (ЛЦДА). – F. 53. Ap. 23. B. 2368.

14. НАРБ. – Ф. 42. Воп. 1. Спр. 295.

15. ЛЦДА. – F. 9. Ap. 13. B. 3299.

16. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 67. Воп. 1. Спр. 34.

17. ЦНА НАН Беларусі. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 2.

**(Дата падачы: 05.02.2024 г.)**

*Ф. Ю. Бохан*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск

*F. Bokhan*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 94(476)“17/18”**

## МАГНАЦКІЯ ПАРТЫІ Ў САЦЫЯЛЬНА-ПАЛІТЫЧНЫМ ЖЫЦЦІ ВКЛ У КАНЦЫ XVII – XVIII СТ.

## MAGNATIC PARTIES IN SOCIAL AND POLITICAL LIFE OF THE GDL IN THE END XVII–XVIII CENTURIES

*У артыкуле разглядаецца дзейнасць магнацкіх аб’яднанняў XVII–XVIII стст. Па выніках аналізу пэўных характарыстык і на падставе факталогіі робіцца абгрунтаванне аб правамернасці ўжывання тэрміну «магнацкая партыя» ў дачыненні да супольнасцяў,*

*якія ставілі перад сабой палітычныя мэты, даказваецца вядучая роля гэтых аб'яднанняў у палітычным жыцці ВКЛ ў XVII–XVIII стст.*

*Ключавыя словы: магнацкія партыі; Вялікае Княства Літоўскае; палітычнае жыццё ВКЛ; шляхта.*

*The article examines the activities of magnate groups of the XVII–XVIII centuries. Based on the results of the analysis of certain characteristics and on the basis of fact, a justification is made for the legality of using the term «magnate party» to communities that set political goals for themselves, the leading role of these associations in the political life of the GDL of the XVII–XVIII centuries is proved.*

*Keywords: magnate parties; Grand Duchy of Lithuania; political life of the GDL; nobility.*

Апошняе стагоддзе існавання Рэчы Паспалітай (РП) прайшло пад знакам узрастання палітычнай актыўнасці шляхты і магнатэрыі. Для каардынацыі сваіх дзеянняў на мясцовым і агульнадзяржаўным узроўнях некаторыя магнаты і залежная ад іх шляхта стваралі арганізаваныя саюзы, удзельнікі якіх ставілі перад сабой задачы атрымання эканамічных і палітычных прэферэнцый. Дзейнасць такіх саюзаў аказвала значны ўплыў на ўнутры- і знешнепалітычнае жыццё ВКЛ у разглядаемы перыяд. Найбольш ярка яна выяўлялася падчас правядзення выбараў у мясцовыя і агульнадзяржаўныя органы шляхецкага самакіравання, а таксама падчас фарміравання персанальнага складу кіруючых органаў мясцовых соймікаў і агульнадзяржаўнага сойма.

Трэба адзначыць, што першыя прыкметы трансфармацыі шырокіх шляхецкіх аб'яднанняў у палітычныя структуры з абазнанымі і прызнанымі іх удзельнікамі-лідарамі можна заўважыць у сярэдзіне XVII ст. На чале такіх палітычных аб'яднанняў стаялі прадстаўнікі пэўных заможных родаў, таму ў гістарыяграфіі для іх пачалі ўжывацца назвы «магнацкія групоўкі» ці «магнацкія партыі».

Тэрмін ці абазначэнне «магнацкая партыя» для апісання формы палітычнай дзейнасці шляхты ў польскай гістарыяграфіі ўзнік у XIX ст. Выраз «Stronnictwo magnackie», які шырока ўжываюць польскія вучоныя, літаральна перакладаецца як «магнацкая партыя». Розначытанняў у гэтым выпадку быць не можа, слова «stronnictwo» ўжываецца менавіта ў сэнсе «палітычная партыя». Дзякуючы гэтаму ў заходняй гістарыяграфіі, напрыклад англамоўнай, магнацкія партыі характарызуюцца тэрмінам «political parties» (палітычныя партыі) або «political factions» (палітычныя фракцыі).

Вызначэнне «партыя» прысутнічае і ў расійскай гістарыяграфіі. У прыватнасці, яго ўжываў С. Салаўёў у працы «Гісторыя падзення Польшчы», апісваючы супрацьстаянне прыхільнікаў Расіі і Францыі ў РП [12]. Акрамя С. Салаўёва, словам «партыя» ў дачыненні да аб'яднанняў шляхты карыстаўся даследчык У. Гер'е [5, с. 133]. Тэрмін «партыя» ў апісанні тагачасных падзей прасочваецца і ў назвах навуковых работ. Напрыклад, у манаграфіі П. Шчабальскага «Руская палітыка і руская партыя ў Польшчы да Кацярыны II» [13].

Сярод айчынных даследчыкаў тэрмін «партыя» ўжываў А. Любы пры характарыстыцы аб'яднанняў прыхільнікаў прэтэндэнтаў на трон падчас грамадзянскай вайны ў ВКЛ (1430–1440 гг.) [7, с. 34, 42].

У цэлым тэрмін «партыі» ў гістарычнай навуцы выкарыстоўваецца як апісанне ўстойлівых саюзаў, у якіх людзі аб'ядноўваліся з мэтай барацьбы за ўладу. Гэты тэрмін адпавядае трактоўцы вызначэння «палітычная партыя». Згодна са «Слоўнікам тэрмінаў па паліталогіі», гэта добраахвотна створанае, арганізацыйна ўпарадкаванае аб'яднанне грамадзян, якія прытрымліваюцца агульных мэт (ідэй, лідараў) і арыентаваныя на атрыманне і выкарыстанне палітычнай улады [1].

Яшчэ адну трактоўку прыводзіць «Слоўнік сацыяльных навук» Оксфардскага ўніверсітэта: «У дэмакратычных грамадствах партыі – гэта арганізацыі, якія звязваюць суб'ектаў грамадзянскага права з афіцыйнымі структурамі ўраду. Звычайна палітычныя партыі фарміруюцца вакол груповак з аднолькавымі каштоўнасцямі, інтарэсамі ці паходжаннем» [16].

Палітычнае жыццё ў ВКЛ у разглядаемы перыяд праходзіла ў рэчышчы агульнадзяржаўных тэндэнцый Рэчы Паспалітай, але мела свае выразныя асаблівасці. Пасля войнаў з Расіяй, Турцыяй і Швецыяй адбылося ўзмацненне некаторых магнацкіх родаў ВКЛ. Так, прадстаўнікі Пацаў і Сапегаў атрымалі за ваенныя заслугі шэраг пасад ва ўрадзе ВКЛ, з дапамогай якіх сталі практычна кіраваць краінай [6, с. 143–145; 15, s. 216–219]. У выніку ў канцы XVII ст. у ВКЛ абвастрыліся палітычныя і эканамічныя супярэчнасці паміж родам Сапегаў, прадстаўнікі якога занялі асноўныя дзяржаўныя пасады ў княстве, і магнацкімі родамі, якія аказаліся адсунутымі ад прадстаўніцтва ў структурах вышэйшага кіравання ВКЛ. Сітуацыя ўскладнялася і паступова перарасла ў адкрытыя сутыкненні.

Канфлікт дасягнуў свайго апагея ў 1695–1696 гг., калі ўся варожая Сапегам магнатэрыя і прыхільная да іх сярэдняя і дробная шляхта кансалідаваліся ў вялікую кааліцыю пад умоўнай назвай «Рэспубліка» [3, с. 182]. Яе ўдзельнікаў пачалі называць «рэспубліканцамі».

Рэспубліканцы змаглі прыняць некаторыя законы, накіраваныя на абмежаванне паўнаўладдзя роду Сапегаў у ВКЛ [3, с. 185; 4, с. 699]. У адказ на гэта Сапегі разгарнулі адкрытае змаганне з рэспубліканцамі. Спрэчкі паміж Сапегамі і іх супернікамі ў выніку перараслі ў грамадзянскую ці «хатнюю» вайну 1696–1702 гг. Спробы сапежанцаў арганізаваць шэраг замахаў на лідараў антысапежынскага руху далі рэспубліканцам падставу правесці са згоды караля Аўгуста II кампанію судовага пераследу Сапегаў і ў выніку дабіцца пазбаўлення іх усіх пасад у княстве [2, с. 112–139]. Сапегі не прызналі такога судовага выраку і працягнулі супраціў, які быў зломлены толькі восенню 1700 г. Для замацавання поспеху рэспубліканцы ўтварылі канфедэрацыю і такім чынам легалізавалі сваю дзейнасць [4, с. 699].

Пасля паразы Сапегі і іх прыхільнікі не перасталі супраціўляцца. Яны звярнуліся за дапамогай да шведскага караля, які ў той час пачаў

Паўночную вайну, і спрычыніліся да абрання на трон РП шведскага прыхільніка Станіслава Ляшчынскага. Дзякуючы гэтаму Сапегі аднавілі сваю ўладу на занятых шведамі землях ВКЛ. Але іх панаванне праіснавала нядоўга і скончылася пасля адступлення Швецыі і выезду Ляшчынскага з РП [4, с. 699].

Такім чынам, у ВКЛ у канцы XVII ст. апанентамі роду Сапегаў была створана так званая антысапежынская кааліцыя – арганізаваная структура, якая заявіла адкрыта сфармуляваную палітычную мэту. Прадстаўнікі антысапежынскай кааліцыі, у якую ўвайшлі прадстаўнікі такіх родаў, як Радзівілы, Агінскія, Вішнявецкія, Пацы і іх прыхільнікі, ставілі перад сабой задачу адхіліць род Сапегаў ад улады і старыць у ВКЛ палітычную сістэму, якая б не давала магчымасці ўзурпацыі выканаўчай улады якім-небудзь родам і забяспечвала шляхце магчымасць рэальнага ажыццяўлення яе «залатых вольнасцяў».

У выніку ўпершыню на тэрыторыі ВКЛ была створана арганізаваная структура, якая ставіла перад сабой адкрыта сфармуляваную палітычную мэту. Натуральна, што мэтай рэспубліканцаў было не проста адхіленне прадстаўнікоў роду Сапегаў ад пасад у ВКЛ, а дасягненне палітычнай улады ў краіне самімі рэспубліканцамі.

Зрабіўшы такую выснову, можна паставіць пытанне: ці правамерна ўжываць адносна шляхецкіх аб'яднанняў на чале з пэўнымі магнацкімі родамі, якія дзейнічалі ў ВКЛ у канцы XVII – XVIII ст. і ставілі перад сабой палітычныя мэты, вызначэнне «магнацкія партыі»?

На сённяшні дзень у беларускай гістарыяграфіі не існуе адзінага погляду на магчымасць ужывання вызначэння «магнацкія партыі», якім, на нашу думку, можна ахарактарызаваць шляхецкія палітычныя аб'яднанні, што існавалі ў перыяд XVII–XVIII стст. і ставілі перад сабой палітычныя мэты. У дадзеным артыкуле вызначэнні «шляхецкія палітычныя групоўкі» і «магнацкія групоўкі» ўжываюцца як раўназначныя, таму што пад першымі разумеюцца шляхецкія аб'яднанні ці групоўкі, на чале якіх абавязкова стаялі прадстаўнікі пэўнага магнацкага роду ці родаў.

Тэрмін «магнацкія партыі» не атрымаў шырокага распаўсюджання ў айчыннай гістарыяграфіі. У навуковай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў беларускімі даследчыкамі звычайна выкарыстоўваецца тэрмін «магнацкія групоўкі» [8; 11]. Магчыма, гэта спадчына савецкай гістарыяграфіі, дзе адлік існавання партый ішоў з моманту ўтварэння РСДРП (1898 г.).

Але вызначэнне «магнацкія групоўкі», на наш погляд, асабліва для тых груповак, якія ставяць перад сабой палітычныя мэты, не зусім дакладна характарызуе сутнасць самой з'явы. Вызначэнне «шляхецкая ці магнацкая групоўка» найбольш прымяняльна для прыдворных груповак, прадстаўнікі якіх змагаліся за асабісты ўплыў на кіраўніка дзяржавы, за атрыманне пэўных эканамічных здабыткаў і інш. Такое вызначэнне можа быць выка-

рыстана для апісання любога шляхецкага аб’яднання на чале з магнатамі. Палітычныя ж саюзы шляхты, створаныя на аснове агульных палітычных інтарэсаў, на імкненні дасягуць улады ці ўтрымаць яе, збліжае гэтыя саюзы ці групоўкі з палітычнымі арганізацыямі, якія ў гістарычнай навуцы і паліталогіі носяць назву «партыя».

На наш погляд, тэрмін «магнацкія партыі» найбольш адпавядае ходу палітычнага жыцця ВКЛ XVII–XVIII стст. пры характарыстыцы тых аб’яднанняў, якія ставілі перад сабой палітычныя мэты. Неабходна яшчэ раз падкрэсліць, што ў канцы XVII ст. у ВКЛ пачынаюць шырока дзейнічаць новыя формы сацыяльна-палітычнай арганізацыі шляхты – доўгатэрміновыя кааліцыі на чале з пэўнымі магнатамі, якія аб’ядноўваліся ў адпаведнасці з палітычнымі поглядамі супраць іншых магнатаў і ў меншай ступені кіраваліся сваяцкімі сувязямі. Практычна гэта былі палітычныя аб’яднанні людзей з аднолькавымі палітычнымі і эканамічнымі перакананнямі, якія пераследавалі канкрэтныя мэты і імкнуліся да дамінуючага становішча ў палітычным і гаспадарчым жыцці краіны.

Прадстаўнікі магнацкіх партый рэгулярна ўдзельнічалі як у выбарах на мясцовыя соймікі, на Трыбунал ВКЛ, так і ў выбарах на вальны сойм. Пры гэтым, несумненна, што кандыдаты ад розных груповак прадстаўлялі палітычныя погляды, у залежнасці ад якіх мясцовая шляхта выказвала прыхільнасць да таго ці іншага прадстаўніка. Па выніках выбараў у асобных паветах можна прасачыць пастаянную змену палітычных поглядаў шляхецкага насельніцтва ВКЛ.

Безумоўна, магнацкія партыі не выказвалі палітычную волю ўсяго насельніцтва краіны, а выступалі толькі як прадстаўнікі свайго саслоўя (стану), і то толькі яго канкрэтнай часткі. Але ж і сёння ніякая палітычная партыя не можа прадстаўляць інтарэсы ўсяго народа, а толькі пэўных сацыяльных, прафесійных, канфесійных і іншых груп.

Важна падкрэсліць, што кожная магнацкая партыя мела выразных лідараў. Нягледзячы на тое, што ў РП і ВКЛ партыйная сістэма ў заканадаўстве не прадугледжвалася і фармальнага замацавання яе не было, легалізаванае фарміраванне шляхецкіх канфедэрацый для дасягнення пэўных палітычных мэтаў давала магчымасць да стварэння аб’яднанняў па-сутнасці палітычнага характару, практычна ўсе вядомыя канфедэрацыі шляхты мелі тыя ці іншыя прыкметы «партыйнасці» [8, с. 584]. Вядома, што месцы кіраўнікоў-маршалкаў канфедэрацый займалі менавіта правадыры магнацкіх партый.

Дасягнуўшы ліквідацыі гегемоніі Сапегаў, «Рэспубліка» раскалолася на групоўку Радзівілаў і групоўку магнатэрыі ВКЛ на чале з Агінскімі і Пацеямі. На глебе незадавальнення палітыкай Аўгуста II апошнія зблізіліся з Сапегамі, якія працягвалі падтрымліваць стасункі з Ляшчынскім. Гэта адбілася на рэпутацыі «рэспубліканцаў» як галоўнай апазіцыйнай сілы, да якой сталі далучацца праціўнікі манарха, у тым ліку і з Польшчы, як магнаты Патоцкія [8, с. 585].

Радзівілы, якія адшчапіліся ў асобную партыю, займаліся абаронай уласных інтарэсаў. У прыватнасці, змагаліся за спадчыну Багуслава Радзівіла, на якую выказалі свае прэтэнзіі Сапегі. Для таго каб авалодаць спадчынай, Радзівілы сталі прыхільнікамі Аўгуста II і ўрэшце дасягнулі сваёй мэты [8, с. 586].

Пасля смерці Аўгуста II у 1733 г. «рэспубліканцы» на чале з Патоцкімі імкнуліся аднавіць кіраванне Станіслава Ляшчынскага. Супраць гэтага выступіла «Фамілія» і Радзвілы, якія выступілі за абранне сына былога караля, Аўгуста III. Тым не менш на элекцыі з падаўляючай перавагай галасоў перамог Ляшчынскі [9, с. 328–329].

Параза Аўгуста на элекцыі не спыніла яго памкненні стаць каралём. Пры падтрымцы войск Аўстрыі, Саксоніі і Расіі ён падавіў прыхільнікаў Ляшчынскага і ў 1736 г. прымусіў таго адмовіцца ад трона [8, с. 586; 9, с. 330–331]. Перамога Аўгуста прывяла да дамінавання Радзівілаў на тэрыторыі ВКЛ і павелічэння ўплыву Чартарыйскіх, з якімі заключылі дынастычныя шлюбы нават былыя «рэспубліканцы» [8, с. 170].

Страціўшы канкурэнтаў у палітычнай прасторы, з другой паловы 1740-х гг. партыя Радзівілаў і «Фамілія» пачалі супрацьстаянне. Каралеўскі двор выступаў на баку Чартарыйскіх, якія былі больш старымі прыхільнікамі манарха і мелі сувязі з Расіяй. Але на пачатку 1750-х гг. стала відавочна, што «Фамілія» перамагае ў гэтым суперніцтве і стане найбольш магутнай партыяй у РП [8, с. 588–589]. У такіх абставінах Аўгуст III у 1754 г. нечакана парваў саюз з «Фаміліяй» і пачаў садзейнічаць Радзівілам і Патоцкім, такім чынам аднавіўшы рух «рэспубліканцаў». Адначасова з гэтым паплечнікі манарха сфарміравалі прыдворную партыю «Камарылью», якая адстойвала пазіцыі караля ў сойме. У выніку «Камарылья» і «рэспубліканцы» фактычна ўтварылі кааліцыю і паспяхова супрацьстаялі «Фаміліі» [8, с. 372, 378–381].

Тым не менш «Фамілія» захавала замежную падтрымку з боку РІ. Карыстаючыся гэтым, у пачатку 1760-х гг. Чартарыйскія сталі вырашаць свае палітычныя праблемы з дапамогай рускай арміі. Так, у 1763 г., пасля няўдалых выбараў у Трыбунал ВКЛ, на дапамогу «Фаміліі» ў РП увашоў 6-тысячны корпус генерала Міхаіла Салтыкова, які павінен быў аказаць ціск на «рэспубліканцаў». Аднак у гэты час памёр Аўгуст III, і палітычная абстаноўка змянілася [8, с. 575–582].

Смерць караля аслабіла праціўнікаў «Фаміліі». «Камарылья», якая існавала за кошт падтрымкі Аўгуста, спыніла існаванне, а «Рэспубліка» не магла вызначыцца з кандыдатурай на наступныя выбары.

У адрозненне ад канкурэнтаў, «Фамілія» знайшла кандыдата. Ім стаў былы дэпутат соймаў і амбасадар РП у РІ Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Панятоўскага актыўна падтрымлівала Расія, якая накіравала для кантролю за ходам выбараў сваю армію. Дзякуючы гэтаму Панятоўскага абралі аднагалосна. Слабыя спробы «рэспубліканцаў» пратэставаць праваліліся, а іх нешматлікія баявыя атрады былі разгромлены рускай арміяй і прыхільнікамі «Фаміліі» [14, s. 16].

Але неўзабаве паміж каралём і «Фаміліяй» узнік канфлікт. Панятоўскі пачаў праводзіць незалежную ад партыі і яе партнёраў з Расіі палітыку. У адказ Расія пачала падтрымліваць антыманархічныя канфедэрацыі дысідэнтаў (некаталіцкага насельніцтва) і «рэспубліканцаў». Але пасля таго, як Панятоўскі пайшоў на саступкі дысідэнтам, Расія скасавала дапамогу «рэспубліканцам» [10, с. 109].

Разрыў Расіі з «рэспубліканцамі» справакаваў утварэнне апошнімі Барскай канфедэрацыі, якая ў 1768–1771 гг. падняла паўстанне супраць караля і Расіі. Канфедэрацыя пацярпела паразу, а паўстанне стала падставай для першага падзелу РП. Канфлікт Расіі з «Фаміліяй» і «Рэспублікай» прывёў да фарміравання новай партыі ў РП – прарасійскай «Партыі гетманаў» на чале з літоўскім гетманам Францішкам Ксаверыем Браніцкім і каронным гетманам Севярынам Ржэвускім [10, с. 109; 17, s. 110–111].

Утварэнне «Партыі гетманаў», якая была непрымірымай як да Станіслава Панятоўскага, так і да антырасійскай шляхты, абумовіла паступовае збліжэнне «Рэспублікі» і «Фаміліі» з сярэдзіны 1770-х гг. Вынікам стала іх аб'яднанне ў другой палове 1780-х гг. у «Патрыятычную партыю» [17, s. 111]. Пры гэтым не ўсе ўдзельнікі «Рэспублікі» і «Фаміліі» былі адзінадумцамі. Некаторыя шляхцічы з «Рэспублікі» і «Фаміліі» ці не далучыліся да яе, ці нават перайшлі ў стан «гетманцаў». У той жа час і некаторыя «гетманцы» змянілі сваю пазіцыю і перайшлі да супернікаў.

Нядоўгая дзейнасць «Патрыятычнай партыі» звязана з Чатырохгадовым соймам 1788–1792 гг. і прыняццем канстытуцыі РП 1791 г. Супрацьстаянне «патрыётаў» і «гетманцаў» па пытанні канстытуцыі прывяло да таго, што апошнія ў 1792 г. утварылі Таргавіцкую канфедэрацыю супраць сойма і справакавалі вайну РП з Расіяй. Гэта прывяло да скасавання канстытуцыі, другога падзелу РП, паўстання на чале з Тадэвушам Касцюшкам (у якім прынялі актыўнейшы ўдзел дзеячы «Патрыятычнай партыі») і, нарэшце, трэцяга падзелу РП і спынення яе існавання [10, с. 164].

Такім чынам, у палітычным жыцці ВКЛ у апошняй трэці XVII – XVIII ст. вядучую ролю адыгрывалі аб'яднанні на чале з магнацкімі дынастыямі, якія можна з упэўненасцю называць магнацкімі партыямі. Кожная з партый мела сваю ідэалогію, кола прыхільнікаў, пэўныя палітычныя мэты і імкненне да дамінавання на палітычным полі. Таксама, як і ў сучасных палітычных аб'яднаннях, у магнацкіх партый існавала сістэма лідараў і своеасаблівага «партыйнага» кіраўніцтва, якое часам утварала канфедэрацыі з чальцоў уласных партый.

Дзейнасць магнацкіх партый распаўсюджвалася не толькі на ўнутраную палітыку ВКЛ і РП, але і закранала знешнепалітычныя адносіны. Так, адсутнасць войнаў паміж РП і РІ на працягу большай часткі XVIII ст. не ў апошнюю чаргу абумоўлена панаваннем партыі «Фамілія», якая дбала за паляпшэнне адносін з Расіяй.

Як вядучая палітычная сіла магнацкія партыі ВКЛ у XVII–XVIII стст. выяўлялі погляды і памкненні пануючага класа. Стасункі магнацкіх

партый вызначалі асноўныя напрамкі палітычнага жыцця краіны і ўплывалі на ўнутрыпалітычныя і знешнепалітычныя працэсы, вынікам якіх стаў крызіс і падзел РП.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. *Бобрович, В. И.* Словарь терминов по политологии: сетевое электронное учебное издание / В. И. Бобрович, Н. И. Марчинская, Л. Н. Криворот. – Минск: МГЛУ, 2018. – 40 с.

2. *Віцько, Д.* Галоўны трыбунал 1698 г.: Судовая расправа над Сапегамі / Д. Віцько // Arche. – 2016. – № 3. – С. 84–139.

3. *Віцько, Д.* Праграма ўраўнавання (каэквацыі) правоў беларуска-літоўскай шляхты з правамі польскай у канцы XVII ст. / Д. Віцько // Молодежь в науке – 2007: приложение к журналу «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»: материалы международной научной конференции молодых ученых, г. Минск, 23–26 октября 2007 г.: в 4 ч. – Минск, 2008. – Ч. 2: Серия гуманитарных наук. – С. 181–186.

4. Вялікае княства Літоўскае: Энцыклапедыя. У 2 т. Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2006. – 792 с.: іл.

5. *Герье, В.* Борьба за польский престол в 1733 году: Ист. дис., сост. по архивским источникам / В. Герье. – М.: Тип. В. Грачева и К°, 1862. – 657 с.

6. *Калодзей, Р.* Жамойцкі соймік як прыклад антыкаралеўскай апазіцыі ў першыя гады панавання Яна III Сабескага / Р. Калодзей // Arche. – 2015. – № 12. – С. 143–163.

7. *Любы, А. У.* Унутрыпалітычная барацьба ў Вялікім Княстве Літоўскім у 30–40-ыя гг. XV ст.: дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. У. Любы. – Мінск, 2006. – 121 с.

8. *Мацук, А. У.* Барацьба магнацкіх груповак у ВКЛ (1717–1763 гг.) / А. У. Мацук. – Мінск: Медысонт, 2010. – 640 с.

9. *Мацук, А. У.* Грамадска-палітычнае жыццё Вялікага Княства Літоўскага ў часы бескаралеўя 1733–1735 гг. / А. У. Мацук. – Мінск: Беларус. навука, 2020. – 366 с.

10. *Несцярчук, Л. М.* Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Манарх, асветнік, мецэнат / Л. М. Несцярчук. – Брэст: Брэсц. друкарня, 2011. – 298 с.

11. *Прыбытка, Г.* Барацьба магнацкіх груповак у XVIII ст. [Электронны рэсурс] / Г. Прыбытка // PAWET. – Рэжым доступу: https://pawet.net/library/history/bel_history/_articles/pryb2/ %D0 %BF %D1 %80 %D1 %8B %D0 %B1 %D1 %8B %D1 %82 %D0 %BA %D0 %B0_ %D0 %B3._ %D0 %B1 %D0 %B0 %D1 %80 %D0 %B0 %D1 %86 %D1 %8C %D0 %B1 %D0 %B0_ %D0 %BC %D0 %B0 %D0 %B3 %D0 %BD %D0 %B0 %D1 %86 %D0 %BA %D1 %96 %D1 %85_ %D0 %B3 %D1 %80 %D1 %83 %D0 %BF %D0 %BE %D0 %B2 %D0 %B0 %D0 %BA_ %D1 %83_xviii_ %D1 %81 %D1 %82.html. – Дата доступу: 2023.

12. *Соловьёв, С.* Сочинения / С. Соловьёв. – М.: Мысль, 1993. – Кн. 10, т. 19–20. – 751 с.

13. *Щебальский, П.* Русская политика и русская партия в Польше до Екатерины II / П. Щебальский. – М.: Унив. тип. (Катков и К°), 1864. – 48 с.

14. *Bartoszewicz, J.* Panowie niemieccy na dworze Stanisława Augusta / J. Bartoszewicz. – Warszawa: Drukarnia Józefa Ungera, 1852. – 228 s.

15. *Kołodziej, R.* Poczatek kryzysu? Funkcjonowanie sejmu Rzeczypospolitej w ostatnich latach panowania Jana III Sobieskiego (1688–1695) / R. Kołodziej // Sejm Królestwa Polskiego i Rzeczypospolitej Obojga Narodów a europejskie reprezentacji stanowe / red. nauk.: D. Kupisz, W. Uruszczak. – Warszawa: Wydaw. Sejm., 2019. – S. 211–227.

16. Political parties [Electronic resource] // Oxford Reference. – 2024. – Mode of access: https://www.oxfordreference.com/display/10.1093/oi/authority.20110803100334707. – Date of access: 2024.

17. *Schmitt, H.* Dzieje Polski XVIII i XIX wieku / H. Schmitt. – Kraków: Druk. «Czasu» W. Kirchmayera, 1867. – T. 3. – 213 s.

**(Дата падачы: 21.02.2024 г.)**

*Ван Ифу*
Белорусский государственный университет, Минск

*Wang Yifu*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 327(510+581+549.1)“2017/2023”**

## ТРЕХСТОРОННИЙ МЕХАНИЗМ СОТРУДНИЧЕСТВА КИТАЯ, АФГАНИСТАНА И ПАКИСТАНА И ЕГО ЗНАЧЕНИЕ ДЛЯ НОРМАЛИЗАЦИИ СИТУАЦИИ В АФГАНИСТАНЕ В 2017–2023 ГГ.

## THE CHINA-AFGHANISTAN-PAKISTAN TRIPARTITE COOPERATION MECHANISM AND ITS SIGNIFICANCE FOR THE NORMALISATION OF THE SITUATION IN AFGHANISTAN IN 2017–2023

*В статье анализируется развитие трехстороннего механизма сотрудничества между Китаем, Афганистаном и Пакистаном в 2017–2023 гг. Устанавливаются факторы, способствовавшие созданию трехстороннего механизма сотрудничества. Рассматриваются результаты пяти встреч министров иностранных дел Китая, Афганистана и Пакистана. Анализируется взвешенная и прагматичная позиция Китая по урегулированию ситуации в Афганистане. Сделан вывод о важности трехстороннего сотрудничества для нормализации ситуации в Афганистане, содействия миру и стабильности в регионе и укрепления сотрудничества в различных областях.*

*Ключевые слова: Афганистан; безопасность; внешняя политика КНР; региональное сотрудничество; Пакистан.*

*The article analyses the development of the trilateral cooperation mechanism between China, Afghanistan and Pakistan in 2017–2023. The factors that facilitated the establishment of the trilateral cooperation mechanism are identified. The results of the five meetings of the foreign ministers of China, Afghanistan and Pakistan are examined. China’s balanced and pragmatic position on resolving the situation in Afghanistan is analysed. It concludes on the importance of trilateral cooperation in promoting reconciliation in Afghanistan, promoting peace and stability in the region and strengthening cooperation in various fields.*

*Keywords: Afghanistan; security; PRC foreign policy; regional cooperation; Pakistan.*

Афганистан и Пакистан являются важными узловыми странами, соединяющими Китай, Южную и Центральную Азию. В связи с этим Китай